# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2024 года*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**10 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.**

| Транскрыпцыя | Правільна |
|---|---|
| [законадаўства] *заканадаўства* | [заканадаўства] |
| [б’эзым’эн:ы] *безыменны* | + |
| [высакайакасны] *высакаякасны* | + |
| [з’м’эн’л’івы] *зменлівы* | [з’м’энл’івы] |
| [γ’эйам’этрычны] *геаметрычны* | [γ’эам’этрычны] |
| [індустрыйал’ізацыйа] *індустрыялізацыя* | + |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 2.**

| | Значэнне слова | Магчымыя прыклады |
|---|---|---|
| 1 | Бліскуча-жоўты, падобны колерам да золата | ***Залатыя промні сонца свяцілі ў вокны.*** |
| 2 | Вытканы, вышыты пазалочанымі ніткамі | ***залаты слуцкі пояс*** |
| 3 | Які складаецца з золата, з’яўляецца золатам | ***залаты пярсцёнак*** |
| 4 | Шчаслівы, радасны (перан.) | ***залатая школьная пара́*** |
| 5 | Вельмі добры па сваіх якасцях; цудоўны, выдатны | ***залаты чалавек*; *залаты характар*** |
| 6 | Дарагі, любімы (зваротак; перан.) | ***Залатыя мае дачушкі, заходзьце!*** |

*За кожны правільны прыклад – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | |
|---|---|---|
| *вастрыць* | ‘збірацца, намервацца ісці, ехаць, адпраўляцца куды-н.’ | ***вастрыць лыжы*** |
| *ездзіць* | ‘здзекавацца з каго-н., прыгнятаць, выкарыстоўваць у сваіх інтарэсах’ | ***ездзіць на карку*** |
| *кідаць* | ‘уступаць у барацьбу з кім-, чым-н., рабіць рашучы выклік каму-, чаму-н.’ | ***кідаць пальчатку*** |
| *мыліць* | ‘моцна прабіраць каго-н., выгаворваць з дакорам’ | ***мыліць галаву*** |
| *перакідаць* | ‘непрыкметна пераходзіць ад адной тэмы размовы да другой’ | ***перакідаць масток*** |
| *хадзіць* | ‘рызыкаваць жыццём, быць у небяспецы’ | ***хадзіць па лязе*** |

*За кожны правільна складзены фразеалагізм – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| Словы, якія не маюць канчатка | Словы з нулявым канчаткам | Словы з матэрыяльна выражаным канчаткам | Словы з двума канчаткамі (у тым ліку нулявымі) |
|---|---|---|---|
| *па-беларуску* | *уцёк-□* | *к-аму-сьці* | *восем-□-сот-□* |
| *адчуваючы* | | *[й-о]й* | *сяк-і-так-і* |
| *дзесьці* | | *здароў[й-э]* | |
| *жалюзі* | | *абыякав-ы* | |
| *сумленна* | | | |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| Назоўнік | Прыметнік | Назоўнік | Прыметнік |
|---|---|---|---|
| *Смалявічы* | ***смалявіцкі*** | *Дуброўна* | ***дубровенскі*** |
| *Хойнікі* | ***хойніцкі*** | *Нарач* | ***нарачанскі*** |
| *Куба* | ***кубінскі*** | *Навагрудак* | ***навагрудскі*** |
| *Падароск* | ***падароскі*** | *Добрынь* | ***добрынскі*** |
| *Старыя Дарогі* | ***старадарожскі*** | *Сула* | ***сульскі*** |
| *Аўцюкі* | ***аўцюкоўскі*** | *Івянец* | ***івянецкі*** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 6.**

| Сказ | Тып памылкі (у выпадку яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт (магчымыя варыянты) |
|---|---|---|
| А | Плеаназм | *Такое ўзаемадзеянне паміж гаспадаркай і навучальнымі ўстановамі традыцыйнае.* |
| Б | Таўталогія | *Гарадскі суботнік праходзіць у межах месячніка па добраўпарадкаванні.* |
| В | Няма памылкі | *Баявое хрышчэнне салдат атрымаў у Сталінградскай бітве.* |
| Г | Плеаназм | *Жыхары горада спявалі хіты розных гадоў.* |
| Д | Неразмежаванне паронімаў | *Значэнне Беларускай АЭС для энергетычнай бяспекі нашай краіны проста велізарнае.* |
| Е | Неразмежаванне паронімаў | *Прафсаюз пастаянна ставіць перад органамі дзяржаўнага кіравання пытанні гарантаванай аплаты працы рабочых і спецыялістаў, занятых у сістэме адукацыі.* |

*За кожнае правільнае вызначэнне тыпу памылкі – 0,5 бала, за кожнае правільнае выпраўленне памылкі – 0,5 бала. За правільнае вызначэнне адсутнасці памылкі – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Была ў вёсцы свая цэркаўка, як і належыць *(мае быць; заведзена)*, на высокім чыстым месцы, добра бачная здалёк*(у)* з той і другой пратокі; цэркаўку гэту*(ю)* ў калгасную пару прыстасавалі пад склад. Праўда, службу за адсутнасцю *(з-за адсутнасці; з прычыны адсутнасці)* бацюшкі яна страціла яшчэ раней, але крыж на макаўцы *(верхавіне, купале)* заставаўся, і старыя бабы раніцамі слалі яму паклоны. Потым і крыж збілі. У апошнія гады двойчы на тыдні садзіўся на старым выгане самалёт, і ці то ў горад, ці ў раён народ прывучыўся лятаць па паветры.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| **А** | **Ліра-эпас** | **Лірыка** | **Драма/драматургія** | **Эпас** |
|---|---|---|---|---|
| **Б** | «Курган»<br>Янкі Купалы | «Роднае слова»<br>Дануты Бічэль | «Паўлінка»<br>Янкі Купалы | «Багіра»<br>Янкі Маўра |
| **В** | **7, 10** | **2, 9, 11** | **1, 6** | **3, 4, 5, 8** |

*За правільна запоўнены радок А – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне роду пералічаных твораў – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| **Аўтар** | **Назва твора** |
|---|---|
| **Якуб Колас** | **«Новая зямля»** |
| **Максім Гарэцкі** | **«Роднае карэнне»** |
| **Васіль Быкаў** | **«Незагойная рана»** |
| **Іван Шамякін** | **«Непаўторная вясна»** |

*За кожнае правільнае вызначэнне назвы твора – 1 бал, за правільнае вызначэнне аўтара – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Агульная ацэнка за выкананне задання складаецца з двух кампанентаў: ацэнкі за аргументацыю спалучэння карціны з вершам і ацэнкі назвы, анатацыі.*

*За кожны аргумент з доказамі (напрыклад, агульнасць вобразаў: у вершы і на карціне ўвасоблены вобраз саду; агульнасць часу стварэння твораў: пачатак XX стагоддзя; агульны настрой: і мастак, і паэт адлюстроўваюць настальгію па родным доме; іншыя) – 1 бал. Максімальная колькасць балаў па гэтым кампаненце – 3. Не прымаюцца аргументы без доказаў і аднолькавыя па сваёй сутнасці.*

*Назва і анатацыя ацэньваюцца наступным чынам:*

| *Колькасць балаў* | *Рэкамендацыі па ацэньванні* |
|---|---|
| 3 | *Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі названы мэта стварэння альбома і адрасат. Памер анатацыі з'яўляецца аптымальным* |
| 2 | *Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая не абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі названы мэта стварэння альбома і адрасат. Памер анатацыі з'яўляецца аптымальным*<br>*АБО*<br>*Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі не названы мэта стварэння альбома або адрасат. Памер анатацыі з'яўляецца аптымальным* |
| 1 | *Прыведзена арыгінальная назва альбома, якая не абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі не названы мэта стварэння альбома або адрасат.*<br>*Памер анатацыі не ўлічваецца* |
| 0 | *Прыведзена назва альбома, якая не абыгрываецца ў анатацыі. У анатацыі не названы мэта стварэння альбома і адрасат. Памер анатацыі не ўлічваецца*<br>*АБО*<br>*Адсутнічае назва ці анатацыя*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае* |